# ХРОНИКА НАУЧНОЙ ЖИЗНИ

## I РЕСПУБЛИКАНСКАЯ НАУЧНО-ПРАКТИЧЕСКАЯ КОНФЕРЕНЦИЯ «НОВЫЕ ТЕХНОЛОГИИ В СОВРЕМЕННОМ ПРОЦЕССЕ ОБУЧЕНИЯ»

***Полоцкий государственный университет, 2 - 3 апреля 2003 года***

Современные образовательные технологии привлекают пристальное внимание исследователей многих научных школ и направлений. Слово «технология» определяется как наука техники, следовательно, технология обучения - это наука обучения. Этим подчеркивается тот факт, что обучение должно осуществляться на научной основе, т.е. преподавателю нужно овладеть совокупностью научных знаний о том, как обучать, чему обучать, почему обучать так, а не иначе, чтобы обучение было эффективным для каждого обучаемого, чтобы в результате затрачиваемых усилий со стороны и преподавателя, и студента были бы положительные результаты. Именно этой актуальной проблеме и была посвящена I Республиканская научно-практическая конференция, организованная кафедрой педагогики ПГУ. На конференцию было заявлено 154 доклада и сделано 64.

На пленарном заседании выступили В.А. Сонин - доктор психологических наук, профессор Смоленского государственного педагогического университета; З.А. Харитончик - доктор филологических наук, профессор МГЛУ; Л.Д. Глазырина - доктор педагогических наук, профессор МГПУ им. М. Танка; М.Ф. Поснова - кандидат педагогических наук, доцент БГУ и др.

Каждый из представленных на пленарном заседании докладов отличался глубиной, тщательной отобранностью материала и представлял особое направление в исследовании вопроса.

До начала конференции был издан сборник материалов, в который вошли статьи как известных ученых, так и начинающих, только входящих в мир науки. В статьях отражено современное состояние проблемы, дано методологическое и практическое обоснование путей и средств ее решения на современном этапе развития педагогического образования в Республике Беларусь.

В работе конференции также принимали участие студенты историко-филологического факультета.

Пленарное заседание проводилось в начале конференции и в конце. На конференции работали мастер-классы по следующим направлениям: педагогика, психология, методика обучения иностранным языкам. Мастер-класс по педагогике проводили старшие преподаватели кафедры Е.В. Дроботова и С.А. Воеводина по теме «Профессиональное развитие личности» со студентами 3 курса технологического факультета, где демонстрировался групповой метод, который в настоящее время является весьма перспективным в обучении на занятиях и в организации самостоятельной работы во внеаудиторное время. Мастер-класс по психологии проводили И.Н. Андреева, кандидат психологических наук, С.В. Остапчук, старший преподаватель кафедры и начинающие преподаватели Н.Н. Струнина и Н.Н. Петриашвили по теме «Эмоциональная компетентность в общении». В организации мастер-классов помогали студенты 3 курса историко-филологического факультета.

Мастер-класс по методике обучения иностранным языкам проводила заведующая кафедрой теории и практики английского языка МГЛУ, кандидат педагогических наук, доцент Р.В. Фастовец по теме «Интенсивное обучение иностранным языкам».

Участники конференции отметили, что проблема использования новых педагогических технологий в современном процессе обучения адресна и востребована, что достаточно актуально. Именно в использовании современных технологий заложен резерв времени для эффективной организации занятия, который необходимо реализовывать грамотно и целенаправленно. В результате обсуждения участники конференции единодушно отметили высокий профессиональный уровень преподавателей, подготовивших мастер-классы. Руководители секций также отметили хороший уровень прочитанных докладов. На секциях прошла дискуссия по обсуждаемым проблемам.

В рамках конференции была проведена публичная защита магистерских диссертаций по специальности «Теория и методика обучения и воспитания» по темам «Обучение аудированию студентов языковых специальностей» (О.П. Казакова) и «Обучение переводу студентов юридических специальностей» (Т.М. Котенкова) - научный руководитель кандидат педагогических наук, доцент А.В. Конышева.

Основными выводами конференции правомерно считать следующее.

В современных условиях любому преподавателю высшего или среднего учебного заведения необходимо ориентироваться в широком спектре современных инновационных технологий, идей, школ, направлений, не тратить время на открытие уже известного. Сегодня быть педагогически грамотным специалистом нельзя без изучения всего обширного арсенала образовательных технологий.

На данном этапе развития педагогической науки необходим научный подход к содержанию обучения. Научность заключается в том, как учить: на основе каких принципов, с помощью каких методов и методических приемов, какова должна быть организация обучения, какие факторы нужно учитывать при обучении и как их учитывать, чтобы получить наилучший педагогический эффект в определенных конкретных условиях.

Особая заслуга конференции - организация защиты магистерских диссертаций. Был отмечен высокий уровень подготовленных работ.

***А.В. Конышева, канд. пед. наук, доцент***

# АСВЕТНІЦТВА І ГУМАНІСТЫЧНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ БЕЛАРУСІ Ў РЭТРАСПЕКТЫВЕ ЧАСУ

Пасля дзесяцігоддзяў замоўчвання беларуская грамадскасць з вялікай цікавасцю звяртаецца да дзейнасці Еўфрасінні Полацкай, славутай асветніцы, яе духоўнай спадчыны. 22 лютага 2002 г. дзеля агульнанацыянальнага святкавання 900-годдзя з дня яе нараджэння распараджэннем прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь быў утвораны арганізацыйны камітэт па падрыхтоўцы і святкаванні юбілейнай даты. Яго ўзначаліў віцэ-прэм'ер Беларускага Урада Уладзімір Дражын. Сярод многіх мерапрыемстваў была і міжнародная навуковая канферэнцыя «Асветніцтва і гуманістычныя каштоўнасці Беларусі ў рэтраспектыве часу: да 900-годдзя з дня нараджэння Еўфрасінні Полацкай», якая адбылася ў Полацкім дзяржаўным універсітэце 30-31 мая 2002 г. Арганізатарамі канферэнцыі з'явіліся Полацкі дзяржаўны універсітэт, Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік. У рабоце канферэнцыі прынялі ўдзел не толькі беларускія навукоўцы, але і замежныя калегі з Расіі, Украіны, краін Балтыі.

Канферэнцыю адкрыў рэктар Полацкага універсітэта, прафесар Эрнст Бабенка. Ен падкрэсліў, што Еўфрасіння Полацкая з'яўляецца не толькі патронкай беларускай зямлі, але і патронкай асветы. Заснаваныя ей манастыры сталі асяродкам асветы ў Полацкім княстве, пры іх працавалі вучэльні, бібліятэкі, скрыпторыі. Быць пераймальнікам адукацыйных традыцый імкнецца Полацкі дзяржаўны універсітэт, які адносіцца да універсітэтаў новага тыпу. Ён паўстаў, як адзначыў рэктар, на базе тэхнічнага інстытута, таму галоўнай задачай на сённяшні дзень стала развіцце гуманітарных накірункаў, каб ператварыць яго ў класічны універсітэт. Э.М. Бабенка ўнёс прапанову аб стварэнні асацыяцыі даследчыкаў па вывучэнню багацейшай гістарычнай спадчыны Полаччыны, якая была з задавальненнем успрынята ўсімі ўдзельнікамі канферэнцыі.

У прывітальным слове старшыня Полацкага гарвыканкама Уладзімір Тачыла адзначыў, што сёння Полацк можна без перабольшвання назваць духоўна-культурным цэнтрам Беларусі. Ніводнаму беларускаму гораду не засталася такая багатая спадчына. І галоўная роля ў стварэнні духоўна-культурных каштоўнасцей належыць славутым землякам Францыску Скарыне, Сімяону Полацкаму, Еўфрасінні Полацкай. У. Тачыла падкрэсліў, што выканаўчая ўлада горада Полацка робіць усе магчымае, каб прадоўжыць асветніцкую місію Еўфрасінні Полацкай, ушаноўваць яе імя, пераўтварыць горад у сапраўдны сусветны гісторыка-культурны цэнтр.

Вядомы расійскі даследчык доктар гістарычных навук Барыс Клос у дакладзе «Жыціе Еўфрасінні Полацкай: праблемы вывучэння і выдання» выказаў некаторыя новыя версіі, звязаныя з яе жыццём. У прыватнасці, маскоўскі гісторык лічыць, што датай смерці Еўфрасінні з'яўляецца 1173 г., а не 1167. Гэта дата прыводзіцца ў працах полацкага базіліяніна Сцябельскага (1781 г.), іншых гістарычных працах. Гэта дата пацвярджаецца, на думку вучонага, гістарычнымі абставінамі. Менавіта ў 1173 г. памер венгерскі кароль Стэфан і імператар Імануіл накіраваўся з войскамі да Венгрыі з мэтай усталявання на троне свайго стаўленіка Белу III. Гэтымі абставінамі тлумачыцца той факт (зафіксаваны ў Жыціе Еўфрасінні Полацкай), што Еўфрасіння па дарозе ў Канстанцінопаль сустрэла Мануіла, які накіроўваўся ў бок Венгрыі.

Цікавасцю вылучаўся даклад кандыдата гістарычных навук, вядомага даследчыка гісторыі Полаччыны Сяргея Тарасава «Хрысціянства Полацкай зямлі X - XIII стст.: культура і палітыка». Доктар гістарычных навук з Брэста Андрэй Гарбацкі ўзняў праблемы веры і розума ў духоўна-маральным жыцці Еўфрасінні Полацкай. Шлях веры стаў для яе шляхам поўнай аддачы сябе служэнню Богу. Выхаваная на Святым Пісанні, на жыццёвай і патрыятычнай літаратуры, Еўфрасіння Полацкая вызначалася разумнай верай. Даследуючы жыццёвы шлях вялікай асветніцы, можна сцвярджаць, што вера неадрыўная ад ведаў і культуры. Разумеючы гэта, Еўфрасіння Полацкая чытала «Ізборнікі» з афарызмамі і выслоўямі, творы з багаслоўскімі тлумачэннямі сутнасці прыроды, кнігі па антычнай гісторыі. Для яе веды заўсёды знаходзіліся ў пастаянным руху і развіцці, дзякуючы чаму ў ведах з'яўляліся ўсе новыя і новыя тэорыі. Гэта тэма была працягнута ў дакладзе маладой даследчыцы з Брэста Ларысы Шэмяцюк, С. Расавецкага з Кіеўскага нацыянальнага універсітэта.

Дзейнасці полацкага дойліда Іаана прысвяціў даклад доктар гітарычных навук Г. Штыхаў. Еўфрасіння Полацкая, паводле яе жыція, калі «стала жыць у манастыры... ўсіх пераўзыходзіла ў посце, малітвах, чуйнаванні начным». Але найпадобная не была адшэльніцай, не адмаўлялася ад сувязі з людзьмі, са знешнім светам, што таксама пацвярджае жыціе. Калі Еўфрасіння дачулася пра майстра дойліда Іаана, звярнулася да яго, і так наладзілася творчая сувязь у будаўніцтве новай царквы ў манастыры на беразе Палаты, за 2,5 км ад Верхняга замка і Сафійскага сабора ў ім. Станаўленню вежападобнага храма ў Полацкай зямлі прысвяціла даклад кандыдат гістарычных навук Л.У. Ганецкая. Навізной матэрыяла вызначаліся даклады М.В. Клімава «Прадметы хрысціянскага культу з помніка Лучна-1», кандыдата гістарычных навук Л.У. Дучыц «Каменныя крыжы Беларусі».

У апошняе дзесяцігоддзе гісторыя Рускай праваслаўнай царквы знаходзіцца ў цэнтры ўвагі даследчыкаў. У сувязі са знаёмствам з новымі архіўнымі матэрыяламі, якімі раней не карысталіся даследчыкі, у гісторыкаў з'явілася магчымасць на шырокай дакументальнай базе вывучыць унікальны вопыт існавання Царквы ва ўмовах антырэлігійнай палітыкі, якая праводзілася ў гады савецкай улады. Гэта тэндэнцыя знайшла адлюстраванне ў рабоце канферэнцыі. У гэтым плане прадстаўляе цікавасць даклад доктара гістарычных навук, прафесара Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага тэхнічнага універсітэта А.М. Кашэварава «Кампанія савецкай улады па ўскрыццю святых мошчаў у 1918 - 1920 гг.». Гэта была адна з першых антыцаркоўных кампаній, накіраваных на падрыў эканамічных і палітычных асноў Царквы. 13 мая 1922 г. у Полацку адбылося злачыннае ўскрыццё дамавіны з мошчамі Еўфрасінні Полацкай. Пасля ўскрыцця мошчы адправілі на атэістычную выставу ў Маскву, адтуль у Віцебск, дзе іх дэманстравалі ў мясцовым краязнаўчым музеі. 23 ліпеня таго ж года было праведзена ўскрыццё мошчаў катапіцкага святога Андрэя Баболі, якія таксама захоўваліся ў Полацку. Кандыдат гістарычных навук І.І. Янушэвіч у дакладзе «Руская праваслаўная царква ў кантэксце нацыянальна-культурных працэсаў у Беларусі (1917 - 1927)» паказаў складаныя працэсы, якія адбываліся ў РПЦ у Беларусі ў адпаведны перыяд. Дакладчык не абышоў і такую праблему, як рэпрэсіі святароў. У 1922 г. у БССР было рэпрэсіравана каля 200 свяшчэннаслужыцеляў.

Як вядома, вялікай справай полацкай ігуменні з'явілася стварэнне Крыжа, які стаў нацыянальным сімвалам Бацькаўшчыны. Нягледзячы на складанасці гістарычных абставін, на працягу стагоддзяў ён знаходзіўся ў Беларусі. На вялікі жаль, у пачатку Вялікай Айчыннай вайны, у час вывазу каштоўнасцей з Магілёва, ён згубіўся. У зробленым вучоным сакратаром Нацыянальнага архіва РБ кандыдатам гістарычных навук Я.І. Бараноўскім даследаванні «Архіўны след Крыжа Еўфрасінні Полацкай» указаны месцы, накірункі, дзе магчыма арганізаваць працу па адшуканню Крыжа.

Натуральна, што ў канферэнцыі актыўны ўдзел прынялі прадстаўнікі Полацкага універсітэта. З грунтоўным дакладам «Духоўнасць як імператыў свабоды і творчасці асобы: гісторыка-сацыялагічны аспект» выступіў вядомы беларускі гісторык і сацыёлаг, загадчык кафедры гісторыі і сацыялогіі Полацкага універсітэта кандыдат гістарычных навук В.І. Шайкоў. Дакладчык вынес на абмеркаванне калег свае азначэнне паняцця духоўнасці. Чалавек адначасова і моцны і слабы. Моцным яго робяць веды, перакананасць і ўпэўненасць у правільнасці абранага шляху, падтрымка сяброў, калег, знаёмых, творчыя поспехі, слабым - шматлікія выпрабаванні жыццёва-прыродных абставін, непаразуменне, здрадніцтва, паразы. У дакладзе В.У. Галубовіча, ст. выкладчыка кафедры гісторыі і сацыялогіі універсітэта, «Асоба Еўфрасінні Полацкай у асвятленні айчыннай гістарыяграфіі» зроблена спроба прасачыць эвалюцыянаванне падыходаў да асвятлення ролі асобы Еўфрасінні Полацкай у найбольш значных працах айчынных гісторыкаў. Дакладчык адзначыў, калі ў першых абагульняючых працах беларускія гісторыкі (У. Ігнатоўскі, М. Доўнар-Запольскі) паставілі Св. Еўфрасінню ў шэраг выдатных асоб айчыннай гісторыі, то ва ўмовах барацьбы з рэлігіяй у БССР у 30-я - 80-я гады XX ст. асвятленне жыццядзейнасці Еўфрасінні Полацкай было спынена. Толькі з апошняга дзесяцігоддзя мінулага стагоддзя жыццядзейнасць асветніцы з рознай ступенню падрабязнасці пачало асвятляцца ў працах беларускіх гісторыкаў.

Кандыдат мастацтвазнаўства Л.М. Сідаровіч прысвяціла свой даклад літаратурна-асветніцкай дзейнасці Сімяона Полацкага, які пачаў сваю педагагічную і выхаваўчую дзейнасць на полацкай зямлі. На працягу васьмі гадоў (з 1656 па 1664 гг.) ён працаваў настаўнікам у Полацкай брацкай школе. У дакладзе знайшла адлюстраванне не толькі выхаваўча-педагагічная дзейнасць знакамітага земляка. Л. Сідаровіч раскрыла змест двух паэтычных зборнікаў С. Полацкага, яго дзейнасць як друкара. Н. Даўгяла пасвяціла выступленне жыццю і дзейнасці Вацлава Аношкі, уніяцкага святара, дзейнасць якога праходзіла ў Заходняй Беларусі да 1944 г.

У мінулым годзе матэрыялы канферэнцыі ўбачылі свет. Яны адрасаваны выкладчыкам, настаўнікам гісторыі, студэнтам, усім, хто цікавіцца гісторыяй асветніцтва і хрысціянства ў Беларусі.

***Уладзімір Навіцкі,***
***намеснік дырэктара Інстытута гісторыі НАНБ,***
***доктар гістарычных навук, прафесар,***
***старшыня канферэнцыі***